# ПЕРАМОЖНАЯ ВЯСНА

*РАМАНЬКОЎ Міхаіл Ягоравіч нарадзіўся ў 1926 годзе ў вёсцы Дубінка Магілёўскага раёна. У 1942 годзе бацька, маці, усе браты і сёстры загінулі ад рук фашысцкіх карнікаў. З 1942 года баец партызанскага атрада № 121. З чэрвеня 1944 года ў дзеючай арміі. Быў сувязістам, затым кулямётчыкам. Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 26 чэрвеня 1945 года ўдастоен звання Героя Савецкага Саюза. З 1945 года пасля звальнення з арміі жыў і працаваў у Магілёве. З 1949 года член Камуністычнай партыі.*

*Памёр у 1966 годзе.*

– Якунькін, бягом за боепрыпасамі! Бягом, табе гавораць! Бачыш, стужка на зыходзе!..

Раманькоў, стараючыся перакрычаць шум бою, напружваў усе свае сілы.

– Спі, міленькі, табе цяпер многа спаць трэба...

Дзяжурная сястра, пачуўшы шэпат, заклапочана памацала лоб далонню, асцярожна паправіла прасціну.

Для ўсіх людзей той дзень быў першым мірным днём. Для Міхаіла Раманькова ён быў яшчэ і першым днём пасля аперацыі. Аб гэтым ведалі ўсе, хто акружаў Раманькова, акрамя яго самога.

Для малодшага сержанта Раманькова яшчэ працягваўся бой...

...Сцелецца густы туман над пясчанымі дзюнамі. Недзе там заліў. Трэба ў што б там ні стала пераадолець гэтыя дзюны, выйсці да Балтыкі, каб не даць фашыстам эвакуіравацца. Такая задача 350-га стралковага палка. Баі не заціхаюць ні днём, ні ноччу. І хоць над светам ззяе май сорак пятага года, тут, на касе Фрыш-Нерунг, гітлераўцы трымаюцца з фанатычыай упартасцю. Люта контратакуюць. Вось і ўчора якраз супраць пазіцыі, якую заняў кулямётны разлік Раманькова, рушылі два бронетранспарцёры. Іх падртымала гармата падбітай "пантэры". "Дарэмна стараешся, фашыст", – працадзіў скрозь зубы Раманькоў. Міхаіл ссунуў набок каску (з дзяцінства прывык так па-заліхвацку кепку насіць), злёгку свіснуў (што азначае "пайшлі"). І папаўзлі Раманькоў з яфрэйтарам Якунькіным і яшчэ трыма байцамі па вільготнаму пяску. Вось ўжо "пантэра", блізка-блізка, а яна сваю справу робіць – паліць снарадамі па нашай пяхоце. Падпаўзлі і чакаюць. Раптам з люка "пантэры" высунуўся назіральнік. Раманькоў выстралам збіў яго, потым сам падабраўся да люка і знішчыў увесь экіпаж. Яго таварышы тым часам напалі на разлікі бронетранспарцёраў.

А сёння, 7 мая, зноў бой. Фашысты раптоўна, без артпадрыхтоўкі, зноў контраатакуюць. Падраздзяленне Раманькова займала нізіну. Пазіцыя яўна нявыгадная. Раманькоў выбраў для свайго разліку месца з добрым сектарам абстрэлу метраў за трыста ўперадзе нашых баявых

парадкаў. Адтуль вёў прыцэльны агонь па ланцугах атакуючых фашыстаў. Назад паварочвалі, падалі зялёныя постаці.

– Гэта вам, гады, за Дубінку, – шаптаў Раманькоў засмаглымі ад узбуджэння губамі.

Дубінка... Родная магілёўская вёсачка нажом паласнула яго... Так заўсёды, у разгар бою, раптам узнікаюць, засціляючы ўсё навокал, два гумны, якія гараць. Там, у гумнах, яго бацька, яго маці, браты, сёстры, там 186 яго аднавяскоўцаў, старых і жанчын, грудных дзяцей. Хтосьці спрабуе вырвацца з агню, але яго тут жа прыстрэльваюць. Фашысты запалілі чалавечы касцёр, усталёўваючы "новы парадак".

Мішу тады, у лютым сорак другога, было шаснаццаць год. Гора яго адразу зрабіла дарослым. Ён пайшоў да партызан. І ў атрадзе, і ў арміі Раманькоў заўсёды шукаў бою, толькі бою. Салдат, якія ведалі цану мужнасці, заўсёды здзіўляла адчайная храбрасць, самаадданасць гэтага юнака. Так было пры наступленні на Нараў у Польшчы. Міхаіл тады быў сувязістам. Аднойчы, калі цягнуў сувязь да роты, яго заўважыў варожы снайпер. Выстрал... Востры боль апёк плячо, гімнасцёрка афарбавалася крывёю, а Раманькоў не здаўся. З тэлефонным апаратам і кабелем дапоўз да КП роты і там страціў прытомнасць.

Калі выйшлі на бераг заліва Фрыш-Гаф, пасля Кенігсберга, Раманькоў са сваім кулямётным разлікам аказаліся на флангу наступаючага падраздзялення. Хтосьці крыкнуў:

– Глядзі, малодшы сержант, фашысты на лодках уцякаюць.

Паглядзеў, на дзвюх "амфібіях" немцы плывуць у бок касы Фрыш-Нерунг.

– Не ўцячэце, забойцы.

Адкрыў па іх адсякаючы агонь і прымусіў прыстаць да берага і здацца ў палон.

Толькі закончыўся бой, як на шасэ паказалася аўтакалона другіх беглых фашыстаў. Кулямётныя стужкі ўжо апусцелі. Раманькоў падпоўз да дарогі і кінуў гранату ў галаўную машыну. Пачуўся страшэнны выбух. У грузавіку былі боепрыпасы, калона спынілася. Тут падаспела наша падраздзяленне і знішчыла калону.

Раптам кулямёт захліпнуўся. Што там здарылася? Наводчык Якунькін крыкнуў:

– Кожух прабіты, – і вылез з акопа, каб залатаць яго.

Бачыць Раманькоў, што памочнік яго абмяк, назад скатваецца. Ранены? Малодшы сержант сам хутка адолеў залатаць прабоіну. Кулямёт зноў запрацаваў. Ранены яфрэйтар Якунькін падаваў патроны. Скончылася апошняя лента, а фашысты ўсё насядаюць... Міхаіл крыкнуў ужо нежывому Якунькіну:

– Бягом за боепрыпасамі!

...Ён не пачуў пераможнае "ўра" нашых салдат, не бачыў, як уцякалі гітлераўцы. Ён быў цяжка ранены. Каб не намаганні ўрачоў, дзевятнаццатая вясна яго жыцця была б апошняй.

Доўга Міхаіл Ягоравіч ляжаў у шпіталі. І толькі праз год пасля вайны, на роднай Магілёўшчыне яго знайшла Залатая Зорка Героя.

**Пераможная вясна // Магілёўская праўда. — 1970. — 16 кастрычніка. — С. 4.**